ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 3 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 631.115.6/7:631.158:331.2(476)(091)«1944/1985»*

*М. У. СМЯХОВІЧ*

# АПЛАТА ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ БССР (1944–1985 гг.)

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 13.01.2015)*

Тыповай якасцю беларускай савецкай гістарычнай школы было імкненне да апалагетыкі палітыкі кіруючай партыйна-дзяржаўнай эліты. Такое становішча ўплывала на распрацоўку аграрнай праблематыкі. Савецкія гісторыкі, у тым ліку і беларускія савецкія гісторыкі, у сваіх даследаваннях адзначалі станоўчыя кірункі і вынікі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці і беларускай вёскі. Многія даследчыкі ў высновах і абагульненнях, зробленых па тых ці іншых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, як правіла, толькі пацвярджалі правільнасць абранага КПСС–КПБ палітычнага і эканамічнага курсу.

У 1974 г. была надрукавана манаграфія А. Белязо «Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945 – 1950 гг.)» [1]. Фактычны матэрыял, які выкарыстаны ў гэтай кнізе, не страціў актуальнасці. Аднак абагульняючыя высновы выкананы ў рэчышчы апалагетыкі аграрнай палітыкі сталінскага кіраўніцтва. «Вера ў калгасны лад дапамагала беларускаму сялянству вытрымаць усе цяжкасці пасляваеннага часу, адбудаваць разбураную вайной гаспадарку, адрадзіць усе даваенныя калгасы, саўгасы, МТС, стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскай гаспадаркі. Гэта стала магчыма толькі дзякуючы перавазе сацыялістычнага ладу, паўсядзённым клопатам і дапамозе Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы», – піша А. Белязо [1, с.159].

У 1982 г. пабачыла свет другая манаграфія А. Белязо «Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1950 – 1960 гг.)» [2]. Гэта быў працяг даследавання гісторыі беларускай вёскі, распачатага ў першай манаграфіі. Фактычны матэрыял, а таксама некаторыя абагульненні гэтай кнігі таксама не страцілі сваёй актуальнасці. Заслугоўвае ўвагі яе сцвярджэнне, што «ў гісторыі калгаснага сялянства і беларускай вёскі 50-я гады займаюць асаблівае месца. Гэта быў перыяд адбудавання даваеннай эканомікі калгасаў і далейшага ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці, завяршэння калектывізацыі сялянскіх гаспадарак заходніх абласцей рэспублікі» [2, с. 183].

Аднак некаторыя іншыя матэрыялы і высновы другой манаграфіі не прайшлі выпрабаванне часам і страцілі актуальнасць. Да прыкладу, сцвярджэнні А. Белязо аб тым, што «сацыяльны прагрэс савецкай вёскі прасочваецца па ўсіх напрамках эканамічнага і культурнага развіцця і больш за ўсё ў няўхільным ўздыме жыццёвага ўзроўню работнікаў сельскай гаспадаркі», што ўсе вытворчыя «дасягненні сталі магчымымі дзякуючы ажыццяўленню ленінскага кааператыўнага плана, перамозе калгаснага ладу ў БССР» выкананы на мове савецкіх прапагандыстаў [2, с. 5].

Адзначаныя асаблівасці ўласцівы і працам іншых беларускіх даследчыкаў аграрнай гісторыі. Праблематыка саўгаснага будаўніцтва ў БССР праз прызму ўдасканалення арганізатарскай і ідэалагічнай працы партыйных камітэтаў саўгасаў у перыяд «развітога сацыялізму» разглядаецца ў манаграфіі Л. Бароўка [3]. Тыя ці іншыя аспекты сялянскага жыцця, калгаснага ладу, кадравай палітыкі разглядалі ў сваіх працах Г. Барадач і К. Дамарад [4], І. Корзун [5], А. Люцко [6], І. Палуян [7], М. Прылепка [8], А. Фірсава [9], М. Шытаў [10], іншыя гісторыкі. У той ці іншай ступені фактычны матэрыял, які змяшчаюць працы гэтых гісторыкаў, прыдатны для выкарыстання і ў сучаснай даследчыцкай працы. У астатнім высновы і абагульненні, зробленыя на старонках адзна-

чаных выданняў, састарэлі. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі асобныя аспекты аплаты працы калгаснікаў былі разгледжаны ў працахА. Ціманавай [11].

Некаторыя пытанні, якія звязаны з заяўленай тэмай, часткова разглядаліся на старонках калектыўных манаграфічных прац, у прыватнасці, у 6-м томе «Гісторыі Беларусі» [12, с. 112, 267, 424].

*Аднак асобнай мэтанакіраванай працы, прысвечанай характарыстыцы працэсу эвалюцыі сялянскіх заробкаў, адлюстраванню яго спецыфікі і асаблівасцей, дагэтуль не існуе.*

**Працадзень і яго кошт.** Важным фактарам матывацыі сялянскай працы была заработная плата. Сістэма аплаты працы калгаснікаў была вельмі простай. На працягу каляндарнага года калгаснікі працавалі на палетках і фермах. Аднак ніякай аплаты працы на працягу 11 месяцаў яны не атрымлівалі. За выкананую працу кожнаму калгасніку налічваліся працадні. Напрыканцы года праўленне калгаса, улічваючы магчымасці арцелі, прымала рашэнне аб аплаце працадзён. Аплата праводзілася ў дзвюх формах: натуральнай і грашовай. Аплата працы ў натуральнай форме прадугледжвала выдачу калгаснікам на працадні той прадукцыі, якую вырабляла калгасная гаспадарка: збожжа, бульба, буракі, сена, салома і інш. Аплата працы грашыма прадугледжвала налічэнне грашовых сродкаў на працадні, іх велічыня залежала ад даходаў канкрэтнага калгаса.

Такім чынам, калгасны працадзень уяўляў сабой спецыфічную форму аплаты працы калгасніка. Яе спецыфіка заключалася не толькі ў спалучэнні натуральнай і грашовай аплаты працы. Працадзень як эканамічная катэгорыя азначаў, што калгаснае сялянства ўдзельнічала ў таварна-грашовых адносінах толькі апасродкавана. Больш таго, вытворчыя адносіны, пабудаваныя на аснове працадня, былі галоўным тормазам, які перашкаджаў развіццю аграрнай вытворчасці. На наш погляд, фактар працадня з’яўляўся аб’ектыўнай перадумовай, якая разбурала палітычную базу савецкага ладу жыцця – саюз рабочага класа з сялянствам. Разам з гэтым пакрысе разбураліся і ўсе іншыя савецкія палітычныя і дзяржаўныя інстытуты.

У перыяд вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў на вызваленай тэрыторыі пры арганізацыі вытворчага працэсу ў калгасах іх адміністрацыйна-кіраўніцкі персанал павінен быў кіравацца пастановай ЦК УКП(б) і СНК СССР «Аб павышэнні для калгаснікаў абавязковага мінімуму працадзён», якая была прынята ў красавіку 1942 г. У ёй падкрэслівалася, што калгаснікі абавязаны выпрацоўваць абавязковы мінімум працадзён, які ў раёнах нечарназёмнай зоны СССР складаў 100 працадзён. Для тых калгаснікаў, якія не выпрацоўвалі абавязковага сезоннага мінімуму, была прадугледжана крымінальная адказнасць папраўча-працоўнымі работамі на тэрмін да 6 месяцаў у калгаснай гаспадарцы з вылікам 25% заробку на карысць калгаса. Тыя калгаснікі, якія не выпрацоўвалі абавязковага мінімуму на працягу года, павінны былі лічыцца асобамі, якія выбылі з калгаса з усімі для іх палітыка-крымінальнымі наступствамі, прадугледжанымі законамі ваеннага часу [13, с. 60]. Гэтая пастанова дзейнічала і на працягу чацвёртай пяцігодкі.

Ужо восенню 1943 г. у вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці з 918 даваенных калгасаў адміністрацыйна было адноўлена 913 [14, с. 89]. Вясной 1944 г. практычна ўсе 954 калгасы Гомельскай вобласці таксама атрымалі ўласную адміністрацыю. Аднак гаспадарчыя работы былі арганізаваны толькі ў 593. У дадзены час калгасы гэтай вобласці мелі толькі адзін трактар на чатыры калгасы і 21 362 рабочых коней (па два-тры кані на калгас) [15, арк. 7–8].

У красавіку-чэрвені 1944 г. калгасныя гаспадаркі вызваленых раёнаў арганізавалі пасяўную кампанію, якая была праведзена жанчынамі, падлеткамі і старымі. Асноўнай формай апрацоўкі калгасных палеткаў была ручная праца. Спачатку трэба было калгасныя палеткі падрыхтаваць да апрацоўкі глебы: засыпаць акопы і траншэі, правесці разміраванне тэрыторыі, ачысціць палеткі ад кустоўя і пустазелля. Затым у асноўным з дапамогай рыдлёўкі ўскапаць і засеяць калгасную ніву. Таму менавіта чалавечы фактар у тых умовах быў асноўным рэсурсам, на якім засноўвалася ўлада ў працэсе першаснага аднаўлення не толькі сельскай гаспадаркі, але і ўсёй эканомікі краіны. Дакладней, гэта быў працоўны гераізм беларускага народа ў цэлым і працоўнага сялянства ў прыватнасці. Усе работы на вёсцы прыходзілася выконваць у асноўным сваімі рукамі ў надзвычай складаных умовах.

Старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці К. Арлоўскі ўспамінаў: «Калі я прыехаў у роднае сяло, то сяла як такога не было. Не было ніводнай авечкі, не было ніводнай свінні, не было ніводнай пабудовы, г. зн. зямля і неба, зямля, якая зарасла бур’янам» [16, арк. 57].

У 1944 г. многія сяляне пры абавязковай выпрацоўцы 132 працадзён выпрацавалі па 300–400 працадзён. У 1945 г. у Беларусі на ручных работах па ўскопванні палеткаў працавала 178 тыс. сялян, у асноўным жанчыны, старыя і дзеці. Аднымі рыдлёўкамі яны ўскапалі больш за 150 тыс. га зямлі (78 тыс. га ў калгасах і 80 тыс. га на сваіх прысядзібных участках) [14, с. 89]. Пры гэтым за ўскапаныя ўручную 0,1 га пашні калгасы налічвалі толькі 1 працадзень [17, арк. 31].

Вясной 1945 г. было праведзена франтальнае абследаванне ўсіх раёнаў усходніх абласцей БССР. У выніку было канстатавана, што становішча аграрнай галіны на месцах заставалася надзвычай цяжкім. Напрыклад, на 1 красавіка 1945 г. у Асіповіцкім раёне налічвалася 94 калгасы, якія аб'ядноўвалі 6977 сялянскіх двароў і 24030 сялян, з якіх толькі 9454 чалавекі былі працаздольнымі (г. зн. на кожны калгас прыпадала толькі каля 100 працаздольных сялян). У раёне налічвалася 1065 коней (11 коней на 1 калгас), з іх 98 коней былі хворымі, а 642 – надзвычай схуднелымі і змардаванымі (60% ад агульнай колькасці), пры гэтым у калгасах увогуле не было трактароў і грузавых аўтамашын. У 1944 г. калгасы гэтага раёна засеялі 5003 га ворыва (50,5 га на 1 калгас), а ў 1945 г. трэба было засеяць 10260 га (120 га на 1 калгас, заданне было павялічана на 140%). Для таго, каб выканаць такі аб'ём ворыва, у раёне вясной 1945 г. былі «прывучаны для сельгасработ 132 каровы» [18, арк.14].

У Круглянскім раёне налічвалася 132 калгасы, якія аб'ядноўвалі 7763 сялянскіх двароў (58 двароў на 1 калгас) і 26826 сялян, з якіх толькі 10450 чалавек былі працаздольнымі (79 працаздольных на 1 калгас). У гэтым раёне налічвалася 1528 коней, з якіх 976 былі хворымі на каросту, знясіленымі і моцна змардаванымі (11 коней на 1 калгас), трактароў не было. Для правядзення пасяўной кампаніі вясной 1945 г. было адабрана «780 кароў, калгасаў і калгаснікаў». У 1944 г. калгасы раёна засеялі 7000 га зямлі (53 га на 1 калгас), а ў 1945г. трэба было засеяць 13135 га зямлі (прыкладна па 100 га на 1 калгас) [18, арк.93]. Прыкладна такім жа цяжкім было становішча сельскай гаспадаркі ў Старобінскім, Мсціслаўскім, Петрыкаўскім [18, арк.18, 95, 119] і іншых раёнах усходніх абласцей Беларусі.

У перыяд вызвалення становішча ў галіне аплаты працы было выключна драматычным. Сяляне працавалі на мяжы фізічных магчымасцей чалавека, грашовая і натуральная аплата амаль адсутнічала. За выкананую працу калгасныя брыгадзіры налічвалі працадні, але грошай для іх аплаты не было, не прыходзілася разлічваць і на натуральную аплату, таму што амаль усю прадукцыю беларускія калгасы накіроўвалі ў фонд дзеючай арміі.

Вельмі нязначна змянілася становішча і ў гады чацвёртай пяцігодкі. На пасады адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу ў калгасах трапляла шмат выпадковых, непадрыхтаваных для гэтай працы людзей. У выніку ў шмат якіх калгасах грамадская маёмасць, зямля, невялікія грашовыя сродкі раскрадаліся. Шматлікія звароты сялян да І. В. Сталіна вымусілі яго прыняць адпаведную пастанову. У 1946 г. была прынята пастанова ЦК УКП(б) «Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі ў калгасах». У Беларусі да крымінальнай адказнасці за парушэнне гэтага Статута ў 1946 г. было прыцягнута 420 чалавек са складу партыйных, савецкіх, гаспадарчых работнікаў, на 1 сакавіка 1947 г. калгасы атрымалі звыш 100 тыс. га сваёй зямлі, якая раней была расцягнута злачынцамі, 625 калгасных будынкаў, каля 1 млн руб., з рахункаў калгасаў было спісана звыш 1124 тыс. працадзён, якія былі незаконна налічаны злачынцам [1, с. 87, 88]. У 1946 г. беларускія калгаснікі выпрацавалі звыш 216 млн працадзён, па якіх налічваўся заробак. Фактычныя заробкі калгаснікаў толькі ў 10% калгасаў ад іх агульнай колькасці у 1946 г. былі наступнымі: на працадзень у сярэднім калгаснікі атрымлівалі 18 кап., 336 г збожжа, 80 г бульбы, 81 г гародніны, 862 г сена, 435 г саломы і мякіны. У астатніх 90% калгасаў калгаснікі не атрымалі ніякай аплаты [1, с. 91].

Мала што змянілася і ў наступныя гады. У 1947 г. калгаснікі таксама на працадні амаль ніякай аплаты не атрымлівалі. На 1 студзеня 1948 г. 94% калгаснікаў не атрымлівалі за работу грошай, 65% – бульбы і гародніны, толькі 41% калгаснікаў было выдадзена на працадні па 200 кг збажыны. У гады чацвёртай пяцігодкі па сутнасці працадні «не мелі ніякай рэальнай вартасці» [1, с. 98, 99].

Становішча не палепшылася і ў перыяд з 1951 па 1953 г. У дакладной запісцы сакратара Гарадоцкага райкама партыі К. Бажанка «Аб стане грамадскай гаспадаркі і мерах па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў раёна» ад 6 студзеня 1951 г., якая была накіравана ў ЦК КП(б)Б,

канстатавалася, што «размеркаванне на працадні калгаснікам амаль адсутнічае, насенныя фонды пад план пасеву на 50% не засыпаюцца». Размеркаванне фонду натуральнай аплаты ў сярэднім па калгасах гэтага раёна ў 1949 г. было наступным: збожжа – 0,5 кг, бульбы –1,2 кг, грошай – 21 кап. на працадзень. У 1950 г. гэтыя паказчыкі склалі: збожжа – 0,4 кг, бульбы – 0,3 кг, грошай – 22 кап. Вельмі красамоўным было і тое, што К. Бажанок прасіў ЦК КП(бБ) «перасяліць ў раён 3000 працаздольных з сем'ямі з другіх раёнаў рэспублікі» [19, арк.12,13,18]. Відавочна, у 1949 і 1950 гг. у калгасах Гарадоцкага раёна пасля разлікаў з дзяржавай засталося мала збажыны і іншай прадукцыі для разлікаў з калгаснікамі на працадні і фарміравання насеннага фонду. Таму натуральная аплата працадня ў гаспадарках гэтага раёна была сціплай: у 1949 г. за 12-гадзінны працадзень калгаснік атрымліваў 0,5 кг жыта, 1,2 кг бульбы і 21 кап. грашыма. У 1950 г. аплата працадня зменшылася. За гэты ж працадзень ён атрымаў на 20% менш жыта і на 25% менш бульбы. У 1950 г. у Гродзенскай вобласці на працадні было размеркавана 23% грашовых сродкаў, якія былі на разліковых рахунках калгасаў па выніках гаспадарчага года. У сярэднім калгаснікі вобласці атрымалі за год на працадні па 190 руб. грошай [20, арк.123].

Аднак агульныя памеры грашовых сродкаў, якія савецкая дзяржава не выплочвала калгасам, былі вельмі вялікімі. На аснове неэквівалентнага абмену і за кошт недаплаты сялянству з калгаснай вёскі збіраліся велізарныя сродкі. Так, за 1946–1953 гг. савецкая дзяржава атрымала з сельскай гаспадаркі 298 млрд руб. нацыянальнага даходу, а накіравала з гэтай сумы ў сельскую гаспадарку толькі 193 млрд руб. Гэта значыць, што 105 млрд руб. перайшло з вёскі ў іншыя галіны эканомікі [21, с. 15]. У асноўным гэтыя сродкі накіроўваліся на адбудаванне і стварэнне новых галін прамысловасці, энергетыкі, гарадской гаспадаркі.

Акрамя неэквівалентнага абмену, савецкая дзяржава атрымлівала вялікі прыбытак за кошт мізэрнай аплаты за нарыхтаваную калгасамі мяса-малочную і раслінаводчую прадукцыю. Да прыкладу, за 100 кг малака дзяржава плаціла калгасу толькі 3 руб., у той час як сабекошт вытворчасці гэтага малака ў калгасах складаў 13 руб. 30 кап., за 100 кг мяса дзяржава выплочвала калгасам каля 7 руб., у той час як сабекошт яго вытворчасці складаў 142 руб. На калгасных рынках малако і мяса каштавалі ў 10–12 разоў даражэй за тую цану, якую дзяржава выплочвала калгасам [1, с. 124]. У выніку такога так званага гандлю за тыя нязначныя грашовыя сродкі, якія дзяржава накіроўвала ў калгасы, яна атрымлівала прыбытак у памеры ад 300 да 1200% на кожны затрачаны рубель.

Зразумела, калгасы і калгаснікі не мелі ніякай матывацыі да выканання заданняў чацвёртай пяцігодкі па павелічэнню вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Сталінскае кіраўніцтва ўлічвала гэтую акалічнасць. Таму быў задзейнічаны падатковы механізм. Кожны сялянскі двор быў абавязаны плаціць падатак на зямлю. І не толькі на зямлю, але і на прыдуманы сталінскімі прыхільнікамі падатак на кожнае пладовае дрэва, незалежна ад таго, давала яно ці не і які ўраджай. У сувязі з тым, што калгасы вельмі слаба займаліся жывёлагадоўляй, дзяржава прымусіла кожны сялянскі двор, прычым незалежна ад яго магчымасці, фактычна дарэмна пастаўляць на нарыхтоўчыя пункты ўстаноўленую колькасць мяса, малака, яек, воўны і іншых прадуктаў. Сялянскія гаспадаркі татальна кантраляваліся і падпадалі пад улік з боку раённых адміністрацыйна-гаспадарчых чыноўнікаў. У выніку сяляне былі вымушаны хаваць свойскую жывёлу: свіней, цялят, авечак, птушку у размешчаных на адлегласці ад жылых пабудоў і прыстасаваных склепах, былых зямлянках, выкапаных і замаскіраваных галлём і дзёрнам ямінах. Толькі з 1 студзеня 1958 г. гаспадаркі калгаснікаў былі поўнасцю вызвалены ад «абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў» дзяржаве [22, с. 331].

Становішча з аплатай працы змянілася пасля верасня 1953 г., калі заработная плата калгаснікаў у разліку на працадзень пачала ўзрастаць. Дынаміка гэтага працэсу адлюстравана ў табл. 1.

Т а б л і ц а 1. **Кошт працадня ў калгасах БССР [23, арк.102]**

| Паказчык | 1958г. | 1959 г. | 1960 г. | 1961 г. | 1962 г. | 1963 г. | 1964 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Працадзень, руб. | 0,53 | 0,55 | 0,65 | 0,74 | 0,70 | 0,91 | 1,06 |
| У % да 1958 г. | 100 | 103,8 | 122,7 | 139,7 | 132,2 | 173 | 200 |

Як вынікае з табл. 1, кошт працадня ў грашовым вылічэнні за перыяд з 1958 па 1964 г. павялічыўся на 100%. У сярэднім за год хрушчоўскай сямігодкі аплата працадня ў грашовым вылічэнні ўзнімалася на 10%. Аднак найбольшага павелічэння заробкаў калгаснікі дачакаліся ў 1962 г. Пачынаючы з гэтага года аплата працадня павялічвалася на 28% у гадавым вылічэнні.

На нашу думку, павелічэнне кошту працадня ў грашовым вылічэнні, якое адбылося ў 1962–1964 гг., было абумоўлена працэсам укаранення гаспадарчага разліку ў калгасах рэспублікі. З іншага боку, значны ўплыў аказала дэнамінацыя савецкага рубля, якая была праведзена М. Хрушчовым у 1961 г.

Сярэднегадавыя паказчыкі, якія прыведзены ў табл. 1, не адлюстроўваюць становішча гаспадарак розных катэгорый – занядбаных і перадавых. Заробкі калгаснікаў гаспадарак адзначаных катэгорый значна адрозніваліся. Згодна з даведкай Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР у 1964 г. аплата працадня ў калгасах рэспублікі была наступнай: да 1 руб. за працадзень налічвалі 329 калгасаў (13,9% ад агульнай колькасці), ад 1да 1,5 руб. – 946 калгасаў (40% ад агульнай колькасці), ад 1,5 да 2,0 руб. – 692 калгасы (29,2% ад агульнай колькасці), ад 2 да 3 руб. – 362 калгасы (15,3%), ад 3да 4 руб. – 35 калгасаў (1,5%), звыш 4 руб. налічвалі 3 калгасы (0,1%) [24, арк. 178].

Статыстычныя даныя сведчаць, што ў 1964 г. 53,9% калгасаў БССР, калі параўнаць узровень аплаты працы калгаснікаў, былі бедным, а 13,9% з іх былі зусім беднымі. Апошнія налічвалі кожнаму калгасніку на працадзень амаль у 2-3 разы менш грошай, чым астатнія гаспадаркі. Заможнымі былі 1,5% калгасаў, якія налічвалі на працадзень ад 3да 4 руб. У 1962–1964 гг. гэта быў значны заробак, калі ўлічыць, што сярэдняя заработная плата па СССР складала прыкладна 70 руб. у месячным вылічэнні. Калі звярнуць увагу на абсалютныя паказчыкі калгаснага заробку, тады гэты «малюнак» будзе не такі ўражлівы. Звесткі аб фактычным узроўні сярэднямесячнай аплаты працы калгаснікам за 1962–1965 гг. адлюстраваны ў табл. 2.

Т а б л і ц а 2. **Сярэднямесячная заработная плата калгаснікаў у БССР (1962–1965 гг.) [24, арк.183]**

| Паказчык | 1962 г. | 1963 г. | 1964 г. | 1965 г. |
|---|---|---|---|---|
| Трактарысты-машыністы | 47 | 51 | 55 | 58 |
| Жывёлаводы | 48 | 61 | 65 | 62 |
| Паляводы | 15 | 20 | 21 | 24 |
| Выдадзена збожжа на працадзень, кг | 8,6 | 11,2 | 10,9 | 17,1 |

Як вынікае з табл. 2, найменшыя заробкі былі ў паляводаў. Нягледзячы на тое, што заработная плата паляводаў з 1962 па 1965 г. павялічылася прыкладна на 75%, у абсалютным вылічэнні яны атрымлівалі месячную заработную плату амаль на 110% менш, чым механізатары і на 120% менш, чым жывёлаводы. Заработная плата жывёлаводаў за гэтыя гады ўзрасла на 30%, а заработная плата механізатараў – на 23,4%. Як бачна, найменшымі тэмпамі павялічвалася заработная плата калгасных механізатараў. На нашу думку, гэта было абумоўлена тым, што машынна-трактарная тэхніка была перададзена калгасам толькі ў 1958 г. У наступныя гады ішоў працэс прыстасавання калгасных гаспадарак да выкарыстання ўласнай машынна-трактарнай тэхнікі. У гэты перыяд вялікай праблемай былі прастоі тэхнікі, у асноўным па прычыне адсутнасці ў калгасах уласнай рамонтнай базы і запасных частак для гэтай тэхнікі. Аднак пасля 1965 г. становішча змянілася, што было абумоўлена мерамі, прынятымі пасля сакавіка 1965 г.

**Сялянская заработная плата пасля 1965 г.** Становішча з заробкамі калгаснікаў непакоіла партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР. Дзеля таго, каб забяспечыць устойлівы рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, трэба было займацца вырашэннем пытання матывацыі працы калгаснікаў. Таму ў маі 1966 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР «Аб павышэнні матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў у развіцці грамадскай вытворчасці», у якой ставілася задача «ўвесці з 1 ліпеня 1966 г. гарантаваную аплату працы калгаснікаў (грашыма і натурай), зыходзячы са ставак адпаведных катэгорый работнікаў саўгасаў». Дзеля гэтага Міністэрству сельскай гаспадаркі СССР было абавязана «зацвердзіць рэкамендацыі па аплаце працы ў калгасах», а Дзяржбанк СССР быў абавязаны прадастаўляць калгасам, якія не мелі грашовых сродкаў, крэдыт на тэрмін да пяці гадоў [25, с. 103–105]. З гэтага часу працадзень перастаў быць рэчаіснасцю

сялянскага жыцця і катэгорыяй эканамічнай навукі. За аснову ўліку адпрацаванага часу быў узяты чалавека-дзень, які пачаў выкарыстоўвацца яшчэ ў 1964 г. Аплата чалавека-дня ў паляводстве праводзілася на аснове нормаў 6-разраднай тарыфнай сеткі выпрацоўкі, якія дзейнічалі ў саўгасах і былі распаўсюджаны на калгасы. У жывёлагадоўлі прымяняўся іншы варыянт аплаты. Заробак налічваўся за дагляд жывёлы і атрыманую прадукцыю.

Працэс пераходу на гарантаваную аплату працы заняў працяглы час. Стандартнага варыянта пераходу не было. Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР падрыхтавала рэкамендацыі, але ў кожным раёне адпрацоўваўся ўласны варыянт пераходу. Напрыклад, у калгасе «Першае мая» Талачынскага раёна, зыходзячы з міністэрскіх рэкамендацый, было распрацавана «Палажэнне аб аплаце працы», 9 жніўня яно было разгледжана на пасяджэнні эканамічнай камісіі райкама партыі, якая рэкамендавала ўсім калгасам раёна ўзяць яго за аснову пры распрацоўцы сваіх палажэнняў. У сувязі з тым, што ў рэкамендацыях Мінсельгаса БССР не было нормаў выпрацоўкі на транспартныя сродкі, будаўнічыя работы, рамонт сельгастэхнікі і інш., на пасяджэнні эканамічнай камісіі Талачынскага РК КПБ была ўхвалена прапанова: звярнуць увагу Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, іншых кіруючых органаў на неабходнасць выдання адзінага для рэспублікі даведніка па аплаце працы ў калгасах.

Згодна са справаздачай начальніка Полацкага раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі А. Якавесценкі, 28 чэрвеня 1966 г. адбыўся 2-дзённы семінар бухгалтараў і эканамістаў калгасаў раёна. На гэтым семінары работнікамі сельгасупраўлення раёна былі растлумачаны і кожнай гаспадарцы раздадзены рэкамендацыі па аплаце працы, падрыхтаваныя раённымі спецыялістамі. Згодна са звесткамі намесніка начальніка Дзяржынскага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі М. Гарленкі ад 13 кастрычніка 1966 г. у кожным калгасе адбыліся агульныя сходы калгаснікаў, на якіх былі прыняты палажэнні «Аб гарантаванай аплаце працы калгаснікаў». Аднак у калгасах імя Дзяржынскага, імя Калініна, «Перамога» аплата працы на гэты момант была вышэй, чым прапісаная ў міністэрскіх рэкамендацыях. Таму рашэннем агульных сходаў у гэтых калгасах «аплата працы захавалася ранейшая» [26, арк. 13, 24, 96, 126]. Начальнік Крычаўскага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі І. Цюркін у сваёй справаздачы ад 8 кастрычніка 1966 г. адзначыў, што яго ўпраўленнем «на прыкладзе двух калгасаў імя К. Маркса (перадавы) і “Савецкая Беларусь” (сярэдні) былі распрацаваны прыкладныя палажэнні аб аплаце працы і рэкамендаваны для іншых калгасаў раёна» [26, арк. 39]. Выкладзеныя факты сведчаць, што працэс пераходу на гарантаваную аплату працы ў калгасах БССР заняў другое паўгоддзе 1966 г.

У выніку пераходу заработная плата калгаснікаў некалькі ўзрасла. Пад час пераходу найбольшую выгаду атрымалі адстаючыя калгасы. У Гомельскім раёне калгаснікі адстаючых калгасаў «За Радзіму» і «Першамайскі» ў 1965 г. на працадзень атрымлівалі адпаведна 1 руб. 36 кап. і 1 руб. 68 кап., пасля пераходу на гарантаваную аплату ў 1966 г. яны пачалі атрымліваць на чалавека-дзень адпаведна 2 руб. 26 кап. і 2 руб. 18 кап. (павелічэнне ў сярэднім склала каля 80%). У гэтым жа раёне калгаснікі перадавых калгасаў «XXII з’езд КПСС» і «Шлях да камунізму» ў 1965 г. на працадзень атрымлівалі адпаведна 3 руб. 24 кап. і 2 руб. 42 кап., а ў 1966 г. на чалавека-дзень адпаведна 3 руб. 28 кап. і 2 руб. 52 кап. (павелічэнне ў сярэднім склала 2%). Такая ж сітуацыя была ўласціва і іншым раёнам. Калі ў раёне было шмат адстаючых калгасаў, заробкі калгаснікаў раёна істотна павялічваліся. Напрыклад, у 1965 г. кошт чалавека-дня ў калгасах Талачынскага раёна складаў 1 руб. 6 кап., у 1966 г. гэты паказчык склаў 2 руб. 23 кап. (павялічыўся ў 2 разы). У іншых выпадках павелічэнне было меншым. Так, калі ў сярэднім у 1965 г. кошт аднаго працадня ў калгасах Бабруйскага раёна складаў 2 руб. 49 кап., то ў 1966 г. кошт чалавека-дня склаў 2 руб. 80 кап. (павялічыўся на 11% ) [26, арк. 43, 107, 129]. У гады восьмай пяцігодкі гарантаваная аплата працы ўсіх катэгорый калгаснікаў пастаянна ўзрастала. Гэта можна прасачыць на прыкладзе калгасных гаспадарак Магілёўскай вобласці. У 1968 г. становішча з заробкамі калгаснікаў у разліку на адзін адпрацаваны чалавека-дзень у гэтай вобласці адлюстравана ў табл. 3.

Статыстычныя даныя сведчаць, што найбольш высокааплатнай катэгорыяй калгаснікаў былі прадстаўнікі адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу – старшыні калгасаў і галоўныя спецыялісты гаспадарак. У сярэднім па Магілёўскай вобласці старшыні калгасаў атрымлівалі заробак у тры разы большы за заробак такіх калгаснікаў, як работнікі конна-ручной працы, жывёлаводы,

у тым ліку і даяркі. У грашовым вылічэнні штомесячны заробак старшынь калгасаў складаў ад 200 да 307 руб., у той час як штомесячны заробак работнікаў, занятых конна-ручной працай, складаў ад 24 да 46 руб., трактарыстаў – ад 69 да 111 руб., жывёлаводаў – ад 74 да 109 руб., даярак – ад 82 да 113 руб. [27, арк.15].

Найбольшыя заробкі атрымлівалі калгаснікі Бялыніцкага і Горацкага раёнаў, найменшыя – калгаснікі Клімавіцкага і Краснапольскага раёнаў. Самай нізкааплатнай катэгорыяй калгаснікаў былі работнікі, занятыя на конна-ручных работах. Гэта былі калгаснікі паляводчых брыгад і жывёлагадоўчых фермаў, якія займаліся нарыхтоўкай і падвозам кармоў, ручной апрацоўкай палеткаў, доглядам садавіны і гародніны, зборам ураджаю. У Клімавіцкім раёне аплата працы калгасніка, занятага на конна-ручной працы, была ніжэй за абласны паказчык на 34,9%, у Краснапольскім – на 28,8%. Розніца ў аплаце працы шмат у чым залежала ад памераў бонусаў. У Горацкім раёне на адзін чалавека-дзень калгаснікі атрымлівалі бонус у памеры 10 кап., у той час як кіраўніцкі персанал атрымліваў бонус у 2 разы большы – па 21 кап. [27, арк. 17].

Т а б л і ц а 3. **Аплата працы чалавека-дня ў Магілёўскай вобласці ў 1968 г., руб. [27, арк. 16]**

| Паказчык | Старшыні калгасаў | Галоўныя спецыялісты | Трактарысты | Работнікі на конна-ручной працы | Жывёлаводы | У тым ліку даяркі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго па вобласці | 10–51 | 7–42 | 5–16 | 2–78 | 3–58 | 3–81 |
| У тым ліку: Горацкі р-н | 12–28 | 8–38 | 6–09 | 2–89 | 4–07 | 4–23 |
| Бялыніцкі р-н | 12–51 | 8–23 | 6–04 | 3–13 | 3–57 | 3–70 |
| Клімавіцкі р-н | 7–69 | 5–81 | 3–72 | 1–81 | 2–79 | 2–92 |
| Краснапольскі р-н | 7–69 | 5–37 | 6–20 | 1–98 | 3–49 | 3–62 |

Сярэднія паказчыкі даюць магчымасць убачыць агульную сітуацыю, але ў канкрэтных гаспадарках становішча было іншым. У 1971 г. у Брэсцкай вобласці ў калгасах сяляне атрымлівалі 52 руб. 42 кап. у месяц, у Гродзенскай – 53 руб. 67 кап., у Мінскай – 65 руб. 17 кап., у Магілёўскай вобласці – 70 руб. 92 кап. [28, арк. 8]. З улікам выплат натурай заробкі сялян былі крыху большымі. Усяго па БССР на адзін чалавека-дзень у 1971 г. прыпадала грошай і прадуктаў на 3 руб. 55 кап., у тым ліку грошай – 3 руб. 43 кап. [28, арк. 8].

Аднак у нерэнтабельных і стратных гаспадарках сітуацыя была іншая. У стратных гаспадарках Брэсцкай вобласці на 1 чалавека-дзень прыпадала 2 руб. 67 кап., розніца з рэспубліканскім паказчыкам складала 76 кап. (26 %) [28, арк. 18]. З цягам часу становішча ў стратных гаспадарках мянялася вельмі марудна. У 1983 г. сярэдні заробак у калгасах БССР складаў 125 руб., у саўгасах – 134,8 руб. [29, с.68]. Аднак у тых гаспадарках, дзе механізатарскія брыгады не былі на гасразліку і іх праца не была звязана з канчатковай прадукцыяй, заробкі былі значна ніжэйшыя. У саўгасе «Зорка» Пухавіцкага раёна механізатары атрымлівалі 114 руб. у месяц, цялятніцы ў саўгасе «Новабеліцкі» – 79 руб., калгасе імя Я. Купалы – 111 руб., у калгасе імя 16 партызан – 91 руб., даяркі ў саўгасе «Шацк» – 115 руб., у саўгасе «Сяргеевічы» – 120 руб. у месяц [30, арк. 137].

**Аплата працы ў калгасах і саўгасах саюзных рэспублік.** Калгасныя гаспадаркі БССР былі складанай часткай агульнасаюзнай калгаснай вытворчасці. Цікава, што становішча з аплатай працы калгаснікаў у саюзных рэспубліках было розным. Згодна з падлікамі спецыялістаў Інстытута эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, за перыяд з 1964 па 1968 г. аплата працы ў калгасах БССР павялічылася ў 1,8 раза, у саўгасах – у 1,4 раза. За гэты ж перыяд аплата працы ў цэлым па сельскай гаспадарцы Літоўскай ССР вырасла ў 2 разы, Латвійскай ССР – у 1,8 раза, СССР – у 1,5 раза. У абсалютным вылічэнні памеры аплаты працы ў калгасах БССР былі ніжэйшымі, чым у калгасах Літвы, Латвіі і Эстоніі, а таксама СССР, што адлюстравана ў табл. 4.

Прыведзеныя ў табл. 4 статыстычныя даныя сведчаць, што аплата чалавека-дня ў калгасах БССР складала толькі 84% ад агульнасаюзнага ўзроўню. Аплата працы ў калгасах рэспублік, якія былі размешчаны ў адной з БССР эканамічнай зоне, была вышэй агульнасаюзнага ўзроўню: у Літве – на 20%, Латвіі – на 18, Эстоніі – на 42%. Аналагічная сітуацыя назіралася і ў саўгасах. Найбольшая розніца была ва ўзроўнях аплаты працы самай масавай катэгорыі калгаснікаў – паляводаў. У 1968 г. у Эстонскай ССР калгаснікі-паляводы зараблялі ў 2 разы больш, чым яны

зараблялі ў калгасах БССР. У саўгасах Эстоніі паляводы зараблялі на 54%, механізатары – на 31%, інжынерна-тэхнічныя работнікі – на 27%, служачыя – на 11% больш, чым у саўгасах БССР. У 1968 г. мінімальная зарплата ў саўгасах па СССР складала 60 руб. штомесяц, у саўгасах БССР – 64 руб., а ў саўгасах Літвы – 71 руб., Эстоніі – 81 руб. [31, арк. 108–111].

Безумоўна, на ўзровень аплаты працы ў калгасах і саўгасах саюзных рэспублік уплывалі розныя фактары: энергаўзброенасць працы, яе прадукцыйнасць, эфектыўнасць выкарыстання машынна-трактарнай тэхнікі і інш. У сельскай гаспадарцы БССР у гэты час на аднаго працаўніка прыпадала 3,7 га ворыва, што было ў 2,1 раза менш, чым у Эстоніі. У 1968 г. у саўгасах БССР на апрацоўку 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў было затрачана 1250 чалавека-дзён, у тым ліку 1030 чалавека-дзён на конна-ручных работах. У Эстоніі гэтыя паказчыкі складалі адпаведна 549 і 349 чалавека-дзён. У калгасах БССР трактарыст толькі 18 дзён у каляндарны месяц (75% рабочага часу) працаваў на трактары, а астані час трактар стаяў. Акрамя таго, у калгасах БССР на 1 трактар прыпадала ў сярэднім 1,4 трактарыста альбо на 0,2 трактарыста больш, чым у Эстоніі. У 1968 г. на аднаго работніка сельскагаспадарчага прадпрыемства ў БССР прыпадала 5,6 конскай сілы энергетычных магутнасцей, у Літве – 8,5, Латвіі – 10,4, Эстоніі – 12,6. У гэты ж год у БССР на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў прыпадала рабочых машын, абсталявання і транспартных сродкаў на 3,5 тыс. руб., у Літве – на 4,5 тыс. руб. (на 33% больш, чым у БССР), Латвіі – на 4,6 тыс. руб. (на 34% больш, чым у БССР), Эстоніі – на 4,7 тыс. руб. (на 35% больш, чым у БССР). Адпаведна ў БССР на 100 га ворыва прыпадала 1,9 трактара, у Літве – 2,3, Латвіі – 2,3, Эстоніі – 2,7 (на 18–20% больш, чым у БССР) [31, арк. 112–127].

Т а б л і ц а 4. **Аплата працы ў калгасах і саўгасах СССР і некаторых саюзных рэспубліках (1967–1968 гг.), руб. [31, арк. 108–111]**

| Рэспубліка | Гады | Саўгасы | | Калгасы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | сярэднегадавая аплата працы рабочага саўгаса | аплата аднаго чалавека-дня | сярэднегадавая аплата працы калгасніка | аплата аднаго чалавека-дня |
| СССР | 1967<br>1968 | 1007<br>– | 3–67<br>– | 759<br>– | 3–32<br>3–52 |
| БССР | 1967<br>1968 | 726<br>791 | 2–75<br>3–20 | 554<br>591 | 2–77<br>2–97 |
| ЛітССР | 1967<br>1968 | 824<br>906 | 3072<br>4–02 | 792<br>783 | 3–73<br>4–27 |
| ЛатвССР | 1967<br>1968 | 973<br>1084 | 3–71<br>4–46 | 862<br>959 | 3–70<br>4–18 |
| ЭстССР | 1967<br>1968 | 1107<br>1212 | 4–29<br>5–13 | 1208<br>1258 | 5–04<br>5–37 |

Відавочна, што ў колькасных адносінах сельская гаспадарка БССР значна саступала калгасам і саўгасам Літвы, Латвіі, Эстоніі ў фондаўзброенасці, апошнія значна лепш забяспечваліся машынна-трактарнай тэхнікай. Таму калгасы і саўгасы БССР знаходзіліся ў эканамічна нявыгадных умовах. У выніку беларускія калгаснікі апрацоўвалі палеткі з дапамогай конна-ручной працы, а літоўцы, латышы і эстонцы – з дапамогай трактароў, рабочых машын і механізмаў. Таму і ворыва ў калгасах і саўгасах БССР на аднаго працаўніка прыпадала значна менш, чым у калгасах і саўгасах рэспублік Прыбалтыкі. Гэта тычылася не толькі раслінаводства, але і жывёлагадоўлі. У 1967 г. узровень механізацыі працы ў калгасах БССР складаў на ўборцы бульбы 50%, а ў Літве – 65, на церабленні льна – 36, а ў Літве – 71, на механізацыі падачы вады на фермах буйной рагатай жывёлы – 51, а ў Літве – 73, узровень механізацыі даення кароў у калгасах БССР складаў у 1968 г. 36, а ў Літве – 72% [31, арк. 116–127]. Яшчэ большым было адставанне калгасаў і саўгасаў БССР па гэтых паказчыках ад гаспадарак Латвіі і Эстоніі.

Адставанне ў фондаўзброенасці і энергаўзброенасці калгасна-саўгаснай вытворчасці ў БССР ад такой жа вытворчасці ў рэспубліках Прыбалтыкі азначала, што калгасы і саўгасы БССР у параўнанні з суседзямі знаходзіліся ў эканамічна нявыгадным становішчы. Гэта істотным чынам уплывала на прадукцыйнасць працы і яе эфектыўнасць: тэрміны, якасць, выніковасць вясенне-палявой сяўбы альбо восеньскай уборкі ўраджаю і інш.

Калі звярнуцца да статыстыкі, можна ўбачыць, што па СССР у 1970 г. у сукупным даходзе сям'і калгасніка даходы ад калгаса складалі 39,3 %, у 1980 г. – 43,0, у 1985 г. – 45,2 %. Даходы ад асабістага дапаможнага падворка ў сукупным даходзе сям'і калгасніка за гэты перыяд складалі адпаведна 31,4, 24,7 і 23,6 % [32, с. 182]. Атрымлівалася, што чым больш сяляне зараблялі ў калгасе, тым менш клапаціліся аб сваім падворку. Кіраўніцтва БССР аб гэтым ведала і карэкціравала заробкі ў калгасах. Дынаміка ўзрастання заробкаў вясковага насельніцтва, якое было занята ў грамадскім сектары вытворчасці, адлюстравана ў табл. 5.

Т а б л і ц а 5. **Сярэднямесячныя заробкі ў калгасах і саўгасах БССР, руб. [33, арк. 39, 45; 29, с. 68]**

| Гаспадаркі | 1970 г. | 1980 г. | 1985 г. |
|---|---|---|---|
| У калгасах | 57 | 102 | 155 |
| У саўгасах | 74 | 118 | 164,2 |
| Сярэднегадавы сукупны даход калгаснікаў у % да сукупнага даходу рабочых і служачых | 82 | 91 | 87 |

Статыстычныя паказчыкі сведчаць, што заробкі ў калгасах у 1970–1980 гг. на 16–17 руб. былі меншыя за заробкі ў саўгасах (на 33 і 15%). У гэтыя гады заробкі калгаснікаў ўзрасталі большымі тэмпамі, чым заробкі ў саўгасах. У 1980–1985 гг. розніца паміж заробкамі ў калгасах і саўгасах змешылася да 9 руб. на карысць саўгасаў (6 %). Адначасова ў даследуемы перыяд захоўвалася розніца паміж сярэднім сукупным даходам калгаснікаў, рабочых і служачых. З улікам уплыву ўсіх фактараў, у прыватнасці даходаў, якія атрымлівалі сяляне ад прысядзібных гаспадарак, яна складала 13–18 % на карысць апошніх.

Калі параўнаць заробкі беларускіх сялян з сялянскімі заробкамі ў іншых рэспубліках СССР, можна адзначыць, што беларускія былі неканкурэнтаздольнымі. У 1985 г. па СССР гэты паказчык складаў 153 руб., БССР па заробках калгасах і саўгасах займала толькі 10-е месца [29, с.68].

Нельга сказаць, што кіраўніцтва Мінсельгаса БССР не бачыла гэтай праблемы. Міністр сельскай гаспадаркі П. Сянько ў дакладзе на пасяджэнні Савета калгасаў БССР, якое адбылося 9 снежня 1982 г., сказаў: «Нашы трактарысты-машыністы атрымліваюць у сярэднім за месяц на 26% менш, чым па краіне, на 14% менш, чым у Літоўскай ССР. Яшчэ большае адхіленне ў аплаце працы сярод работнікаў жывёлагадоўлі» [34, арк. 49]. Як патлумачыў міністр, такое становішча склалася таму, што «ў шэрагу калгасаў і саўгасаў не ў поўнай меры прымяняюцца дзеючыя ўмовы аплаты працы, людзі не даатрымліваюць гарантаванае. Надзвычай недастаткова прымяняецца заахвочванне працаўнікоў за якаснае выкананне работ. Паводле ўмоў на гэтыя мэты прадугледжана выдаваць ад 8 да 12% гадавога заробку, а ў гаспадарках … даплаты за якасць склалі ўсяго толькі 0,6% гадавога заробку» [34, арк. 50].

У шмат якіх гаспадарках БССР трактарыстам-машыністам на працягу пяцігодак не выплочваўся дадатковы заробак за павелічэнне тэрмінаў эксплуатацыі трактароў і камбайнаў, за эканомію прамых выдаткаў на адзінку атрыманай прадукцыі, паліўна-змазачных матэрыялаў, не праводзілася атэстацыя працоўных месцаў, трактарыстам, жывёлаводам не прысвойваліся званні майстра жывёлагадоўлі I і II класаў. На 1 студзеня 1973 г. у калгасах Мінскай вобласці ўдзельная вага даярак, якія мелі кваліфікацыю майстра I і II класаў, складала толькі 6%. Асноўнай прычынай, якая не дазваляла атрымаць класнасць, быў адукацыйны ўзровень. На гэты момант 70% даярак мелі пачатковую адукацыю, а сярэднюю – толькі 3% [56, с.74]. У 1982 г. у Брэсцкай вобласці налічвалася толькі 4,5% жывёлаводаў, якія мелі адзначаныя класныя званні, у Гродзенскай – 7,5% [34, арк. 50].

Узнікае пытанне: чаму партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР не надавала гэтай праблеме належнай увагі? Ні на XXVIII, ні на XXIX, ні на XXX з'ездах КПБ аб гэтым не вялася размова. На нашу думку, адной з прычын такога недастаткова ўважлівага стаўлення вышэйшага рэспубліканскага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, адміністрацыйнага кіраўніцтва сельгаспрадпрыемстваў да сялянскіх заробкаў было імкненне знізіць выдаткі сельгасвытворчасці, знізіць рост сабекошту сельгаспрадукцыі, калі павышэнне заробкаў калгаснікаў аказвала значны ўплыў на гэты паказчык. Другой істотнай прычынай было сістэматычнае невыкананне рэспублікай дырэктыўных паказчыкаў, якія былі вызначаны на IX, X і XI пяцігодкі. Трэцяй прычынай былі пра-

блемы з прадукцыйнасцю працы. За перыяд з 1971 па 1981 г. асноўныя фонды гаспадарак у жывёлагадоўлі павялічыліся ў 3 разы, комплексная механізацыя працы – у 4 разы, а нагрузка на 1 працаўніка, які абслугоўваў буйную рагатую жывёлу, узрасла толькі на 20% і склала ў сярэднім па калгасах і саўгасах БССР толькі 24 галавы, у Літве – 29, Латвіі і Эстоніі – 36 галоў [34, арк. 51]. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР улічвала гэтыя фактары і не надавала належнай увагі заробкам калгаснікаў. У 1985 г. на нарадзе ў першага сакратара ЦК КПБ прагучала заклапочанасць, што ў XI пяцігодцы «заробкі рабочых і служачых узраслі на 16 %, а калгаснікаў – на 32 %. Калгаснік, рабочы саўгаса становяцца ўладальнікамі вялікіх грошай і яму практычна не трэба займацца асабістай гаспадаркай, якая была для яго крыніцай грошай», – лічыла кіраўніцтва ЦК КПБ [36, арк. 18]. Вось гэты матыў (калі ў калгасніка будзе шмат грошай, яму не трэба будзе займацца ўласнай прысядзібнай гаспадаркай) адыгрываў не апошнюю ролю ў тым, што заробкі калгаснікаў у БССР былі параўнальна нізкімі.

Такім чынам, важным фактарам стымулявання сялянскай працы была заработная плата. У перыяд з 1944 па 1965 г. формай заробку калгаснікаў быў працадзень, які не з'яўляўся інструментам матывацыі калгаснікаў да павелічэння прадукцыйнасці працы. Партыйна-дзяржаўная эліта БССР займала кансерватыўную пазіцыю і не надавала гэтаму фактару належнай увагі. Гэта адмоўным чынам уплывала на выкананне рэспублікай пяцігадовых планава-дырэктыўных паказчыкаў.

Калгасны працадзень быў спецыфічнай формай аплаты працы калгасніка. Яе спецыфіка заключалася не толькі ў спалучэнні натуральнай і грашовай аплаты працы. Працадзень як эканамічная катэгорыя азначаў, што калгаснае сялянства ўдзельнічала ў таварна-грашовых адносінах толькі апасродкавана. Вытворчыя адносіны, пабудаваныя на аснове працадня, былі галоўным тармазам, які перашкаджаў развіццю аграрнай вытворчасці.

У перыяд вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў становішча ў галіне аплаты працы было выключна драматычным, грашовая і натуральная аплата амаль адсутнічала. У гады чацвёртай пяцігодкі становішча ў галіне аплаты працы калгаснікаў не змянілася. Агульныя памеры грашовых сродкаў, якія ў 1946–1953 гг. савецкая дзяржава не выплочвала калгаснікам, былі вельмі вялікімі. На аснове неэквівалентнага абмену і за кошт недаплаты сялянству з калгаснай вёскі збіраліся велізарныя сродкі. Становішча пачало выпраўляцца толькі ў гады сямігодкі.

У 1966 г. працадзень перастаў быць рэчаіснасцю сялянскага жыцця і катэгорыяй эканамічнай навукі. За аснову ўліку адпрацаванага часу быў узяты чалавека-дзень. Найбольш аплатнай катэгорыяй калгаснікаў былі прадстаўнікі адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу– старшыні калгасаў і галоўныя спецыялісты гаспадарак. У сярэднім старшыні калгасаў атрымлівалі заробак у тры разы большы за заробак калгаснікаў. Самай нізкааплатнай катэгорыяй калгаснікаў былі работнікі паляводчых брыгад і жывёлагадоўчых фермаў, якія займаліся нарыхтоўкай і падвозам кармоў, ручной апрацоўкай палеткаў, доглядам садавіны і гародніны, зборам ураджаю.

Заробкі беларускіх сялян у праўнанні з сялянскімі заробкамі ў іншых саюзных рэспубліках былі неканкурэнтаздольнымі. У маштабах СССР па памерах заробкаў у калгасах і саўгасах беларускія сяляне займалі толькі 10-е месца.

## Літаратура


1. *Белязо, А. П* Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945–1950 гг.) / А. П. Белязо. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1974. – 176 с.

2. *Белязо, Е. П.* Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1950–1960 гг.) / Е. П. Белязо. – Минск: Наука и тэхника, 1982. – 206 с.

3. *Боровко, Л. В.* Укрепление и развитие совхозов. Из опыта Компартии Белоруссии по руководству совхозным строительством/Л. В. Боровко. – Минск: Беларусь, 1981. – 176 с.

4. *Барадач, Г. А.* Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР / Г. А. Барадач, К. І. Дамарад. – Мінск, 1959. – 166 с.

5. *Корзун, И. П.* Преодоление различий между городом и деревней в быту и культуре: ист.-этнограф. исслед. / И. П. Корзун. – Минск: Наука и техника, 1972. – 160 с.

6. *Люцко, А. В.* Деятельность КПБ по подбору, воспитанию и расстановке руководящих кадров (1946–1950 гг.) / А. В. Люцко. – Минск: Изд-во БГУ, 1975. – 176 с.

7. *Полуян, И. В.* Технические кадры белорусской деревни и развитие сельского хозяйства республики / И. В. Полуян. – Минск: Наука и техника, 1978. – 224 с.

8. *Прилепко, М. В.* Деятельность компартии Белоруссии по улучшению руководства колхозными парторганизациями в борьбе за подъем сельского хозяйства (1953–1958): автореф. дис. …канд. ист. наук: 07.00.01. / М. В. Прилепко. – Минск: БГУ, 1963. – 22 с.
9. *Фирсова, Е. И.* Осуществление в Белоруссии ленинских идей всеобщей грамотности / Е. И. Фирсова. – Минск: Наука и техника, 1970. – 85 с.
10. *Шитов, Н. А.* В борьбе за укрепление и развитие колхозов:1953– 1961 гг. / Н. А. Шитов. – Минск: Беларусь, 1971. – 176 с.
11. *Тимонова, А. В.* Крестьянство на освобожденной территории БССР (сентябрь 1943 – май 1945 г.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02. / А. В. Тимонова. – Минск, 2011. – 25 с.
12. Гісторыя Беларусі: у 6 т./ рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.].–Мінск: Соврем. шк.: Экоперспектива, 2011.– Т.6: Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]. 2011. – 728 с.
13. *Волков, И. М.* Колхозы СССР в годы четвертой пятилетки (1946–1950 гг.) / И. М. Волков // Развитие сельского хозяйства СССР в послевоенные годы (1946–1970гг.): сб. ст. / редкол.: И. М. Волков (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука и техника, 1972. – С. 41–71.
14. *Тимонова, А. В.* Крестьянство БССР в послеоккупационный военный период (осень 1943 – весна 1945 г.) / А. В. Тимонова // Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн. Кн. 2. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.].– Минск: Беларус. навука, 2010. – С. 86–114.
15. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 56.
16. Стенограмма совещания председателей передовых колхозов // НАРБ.– Ф. 4п. Воп. 46. Спр. 706. Арк. 2-505.
17. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 31.
18. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 160.
19. Докладная «О состоянии общественного хозяйства и мерах по организационно-хозяйственному укреплению колхозов от секретаря Городокского РК КПБ К. Божанка т. Зимянину М. В. от 06.01.1951 г.» // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 546. Арк. 13–18.
20. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 538.
21. Матэрыялы пленума ЦК КПСС, 15–16 сак. 1989 г. – Мінск: Беларусь, 1989. – 64 с.
22. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). – Изд. 8-е. – Т. 7: 1955–1959. – М.: Политиздат, 1971. – 552 с.
23. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 9. Спр. 6504.
24. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 9. Спр. 6505.
25. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). – Изд. 8-е. Т. 9: 1966–1968. – М.: Политиздат, 1972. – 520 с.
26. Отчет Полоцкого, Кричевского, Держинского районных управлений сельского хозяйства о проделанной работе по внедрению гарантированной оплаты труда колхозников // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 9. Спр. 7126. Арк. 39–40; 126–129; 130–131.
27. НАРБ. – Ф. 30. Воп. Спр. 2961.
28. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 45.
29. Сельское хозяйство Беларуси в цифрах 1980–2007 гг.: тенденции развития / сост. В. С. Сакович; под науч. ред. В. Г. Гусакова. – Минск: Ин-т системных исслед. в АПК НАН Беларуси, 2008. – 334 с.
30. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2788.
31. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 859.
32. Колхозы в СССР. Краткий статистический сборник. Госкомстат СССР, Госагропром СССР. – М.: Финансы и статистика, 1988. – 223 с.
33. Сельское хозяйство Беларуси в цифрах // НАРБ. – Ф. 30. Воп. 13. Спр. 894. Арк. 39, 45; 29.
34. Протоколы № 5–6 заседаний Совета колхозов и документы к ним // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2814. Арк. 4–174.
35. *Тарасевич, В. Ф.* Социальное планирование на селе / В. Ф. Тарасевич, В. В. Лешкевич.– Минск: Урожай, 1976. – 143 с.
36. Стенограмма совещания у т. Слюнькова // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 46. Спр. 1159.

*M. U. SMYAKHOVICH*

**LABOR PAYMENT IN KOLKHOZ AND SOVKHOZ ORGANIZATIONS IN THE BELARUSIAN SOVIET SOCIALISTIC REPUBLIC (DURING THE 1944–1985 YEARS)**

## Summary

During all the time the salary was an important stimulation factor for country work. In the period from 1944 to 1965 the workday was a form of wage of collective farmers, but at the same time it wasn't the instrument of their motivation to labor productivity growth. The Party and state elite of BSSR have taken up conservative position and didn't pay much attention to this factor. Such their position had a negative impact on performance of indicators of five-year plans.

In 1966 the workday ceased to exist. Instead workday the man-day has been taken as a basis to account the wage of collective farmers. Most of the paid category of collective farmers was a group of administrative personnel representatives including chairmen and chief specialists of farms. On average, they received three times more than other collective farmers. Employees of field crews and stock-raising farms which have been engaged into preparation of forages, manual processing of fields, care of crops of gardens and kitchen gardens were the lowest-paid category of collective farmers.